Created in Master PDF Editor - Demo Version

Государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ

Сборник научных трудов

Выпуск 1

Минск
РИВШ
2017

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



*Мацюш Павел*
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», Мінск, Беларусь

*Matsiush Pavel*
Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus

**УДК 94(476)«18/19»:658**

# МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ І ІХ УПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА

# MODERNIZATION PROCESSES IN THE INDUSTRY OF BELARUS IN THE XIX – EARLY OF XX CENTURY AND THEIR INFLUENCE ON FORMATION OF INDUSTRIAL SOCIETY

*У артыкуле разгледжаны асобныя пытанні фарміравання індустрыяльнага грамадства ў Беларусі на фоне мадэрнізацыі айчыннай прамысловасці ў XIX – пачатку XX стагоддзя. Паказана асаблівая роля прамысловасці ў гаспадарчым жыцці і трансфармацыі сацыяльнай структуры беларускага грамадства ў акрэслены перыяд.*

*Ключавыя словы: мадэрнізацыя; спецыялізацыя; індустрыяльнае грамадства; аграрнае (традыцыйнае) грамадства; прамысловасць; прамысловы пераварот; фабрычная вытворчасць; эканоміка.*

*The article deals with particular issues of formation of industrial society in Belarus on the background of the domestic industry modernization in the XIX – early XX century. The author shows the special role of industry in economic life and the transformation of the social structure of the Belarusian society in the certain period.*

*Keywords: modernization; specialization; industrial society; agricultural (traditional) society; industry; the industrial revolution; factory production; economy.*

Вывучэнне пытанняў мадэрнізацыі прамысловасці Беларусі ў XIX – пачатку XX стагоддзя займае важнае месца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі. У акрэслены перыяд адбываецца станаўленне і развіццё індустрыяльнага грамадства, якое паступова прыйшло на змену аграрнаму (традыцыйнаму). Такая трансфармацыя садзейнічала не толькі ажыўленню эканомікі рэгіёна, але і прывяла да істотных змен у сацыяльнай стуктуры, спрыяла абуджэнню культурнага жыцця і нацыянальнага пытання.

Розныя аспекты названай праблемы разгледжаны ў даследаваннях М. В. Біча, М. Ф. Болбаса, З. Я. Абезгаўза, А. М. Лютага, К. І. Шабуні,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



С. М. Самбук і інш. У меншай ступені распрацаваны такія пытанні мадэрнізацыі беларускага грамадства ў XIX – пачатку XX стагоддзя, як сацыяльная стратыфікацыя насельніцтва, яго мабільнасць, асаблівасці функцыянавання саслоўных інстытутаў, змены ў менталітэце людзей, станаўленне элементаў грамадзянскай супольнасці, узаемасувязі этнакультурных і палітычных кампанентаў.

Працэс мадэрнізацыі прамысловасці ў Беларусі тэхналагічна быў звязаны з пераходам да фабрычна-заводскай індустрыі. Дасягнуты яшчэ ў першай палове XIX стагоддзя ўзровень мануфактурай вытворчасці, падзел і спецыялізацыя працы стваралі матэрыяльныя перадумовы для пачатку трэцяй, фабрычнай, стадыі развіцця прамысловасці [1, с. 75].

Паступова пад уплывам тэхнічнага перавароту цалкам змянілася аблічча беларускай прамысловасці. XIX стагоддзе пачалося як «стагоддзе пара», а заканчвалася як «стагоддзе электрычнасці». Пры гэтым з'яўленню на сваёй зямлі і першых паравых рухавікоў, і першай электрастанцыі Беларусь абавязана менавіта прыватнай ініцыятыве і намаганням айчынных прадпрымальнікаў. Першыя фабрыкі з паравымі рухавікамі ў беларускіх мястэчках Хомск і Косава належалі слонімскаму памешчыку і прамыслоўцу В. Пуслоўскаму. У 1824 годзе прайшлі паспяховыя выпрабаванні на Сожы першага беларускай парахода, пабудаванага англічанінам-механікам Адамам Смітам па распараджэнні ўладальніка Гомельскага маёнтка графа Мікалая Румянцава. А ў 1889 годзе дала ток электрастанцыя ў Добрушы, якая паклала пачатак беларускай электрыфікацыі [2].

Варта адзначыць, што яшчэ да скасавання прыгону ў Беларусі даволі актыўна пачала прымяняцца машынная праца і, звычайна, на прадпрыемствах, заснаваных дваранамі-памешчыкамі. Але гэта не было сведчаннем таго, што прамысловы пераварот пачаўся з сярэдзіны 20-х гадоў XIX стагоддзя. Без наяўнасці свабоднай прафесійнай рабочай сілы гаварыць аб ім было немагчыма. З'яўленне паравога рухавіка стала перадумовай прамысловага перавароту, а не самім пераваротам. Такім чынам, у першай палове XIX стагоддзя мы можам гаварыць не пра пачатак індустрыялізацыі, а толькі аб перадумовах і першых кроках да яе [3].

Прамысловы пераварот – гэта доўгачасовы працэс. Паказчыкам яго завяршэння ў той ці іншай краіне з'яўляецца дасягненне ўзроўню, калі ў галоўных галінах прамысловасці большасць прадукцыі выпрабляецца прадпрыемствамі, абсталяванымі машынамі, якія працуюць на паравой або электрычнай цязе. Невыпадкова, што індустрыялізацыя заўсёды суправаджаецца ўкараненнем машын у шырокім спектры вытворчасцей, а таксама структурнымі пераўтварэнні ў прамысловасці.

У розных рэгіёнах і галінах мадэрнізацыя прамысловасці Беларусі адбывалася нераўнамерна. У бабаўнянай галіне прамысловы пераварот

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

пачаўся раней і хутчэй скончыўся. А ў цэлым у краіне машынная вытворчасць заняла пануючыя пазіцыі ў канцы XIX стагоддзя. Гэта было звязана з прамысловым уздымам 1890-х гадоў.

Тэхнічны бок прамысловага перавароту, які характарызаваўся дамінаваннем буйной машыннай вытворчасці, садзейнічаў істотнаму павелічэнню прадукцыйнасці працы. Развіццё буйной машыннай індустрыі спрыяла далейшаму росту грамадскага падзелу працы, з'яўленню новых галін вытворчасці (машынабудаўнічая, хімічная і інш.), хуткаму росту гарадоў і прамысловых цэнтраў, будаўніцтву чыгунак. Прамысловы пераварот прывёў да карэнных змяненняў у сістэме транспартных камунікацый. Чыгуначны рух садзейнічаў уздыму гарадоў і мястэчак, пра якія раней было мала што вядома. Увогуле буйнамаштабнае чыгуначнае будаўніцтва ў другой палове XIX стагоддзя стала найважнейшым фактарам, які фарсіраваў прамысловы пераварот і працэс фарміравання індустрыяльнага грамадства [4, с. 269].

Разгорнутае чыгуначнае і прамысловае будаўніцтва садзейнічала імклівам развіццю галін прамысловасці, якія арыентаваліся на вытворчасць сродкаў вытворчасці. Калі агульны аб'ём прамысловай прадукцыі Беларусі ўзрос у 6,8 раза, то ў цяжкай прамысловасці гэты паказчык быў вышэй у 12 разоў. Найбольш вялікія фабрыкі і заводы размяшчаліся ў гарадах. Тым не менш, больш за 60 % фабрык і заводаў Беларусі і каля паловы занятых на іх рабочых знаходзіліся ў сельскай мясцовасці. Гэта ў значнай ступені было абумоўлена спецыялізацыяй беларускай прамысловасці.

Паступова ўся гаспадарка Расійскай імперыі, у тым ліку і Беларусі, пераходзіла на індустрыяльныя рэйкі. У 80–90-я гады XIX стагоддзя адкрываюцца машынабудаўнічыя і іншыя металаапрацоўчыя заводы, якія сталі арыентавацца на імпартную сыравіну. У цэлым ва ўсёй металаапрацоўчай прамысловасці Беларусі колькасць заводаў з 1860 па 1900 год узрасла ў 13 разоў.

У тэкстыльнай прамысловасці большасць фабрык складалі суконныя. Апрацоўкай лёну займалася ільнопрадзільная фабрыка «Дзвіна» ў Віцебску.

У пасляэформенны перыяд хутка расла колькасць фабрык у дрэваапрацоўчай і асабліва лесапільнай прамысловасці. Гэтаму спрыяла будаўніцтва чыгунак, побач з якімі з'явілася шмат лесапільняў. У канцы XIX стагоддзя ў Беларусі паравыя лесапільні складалі 45 % ад усіх ле-сапільняў. Яны аб'ядноўвалі 46 % усіх лесапільшчыкаў і выраблялі 52 % валавой прадукцыі ў галіне лесапілавання. З лесапілаваннем цесна была звязана вытворчасць фанеры. Такіх фабрык у 1900 годзе налічвалася 17. Дрэваапрацоўчая галіна стымулявала развіццё і запалкавай вытворчасці. Усяго ў дрэваапрацоўчай прамысловасці Беларусі ў канцы XIX стагоддзя, па падліках З. Я. Абезгаўза, налічвалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



90 фабрык, на якіх працавалі 3064 рабочыя і выпускалася прадукцыі на 3,6 млн руб. [5, с. 53].

Колькасць фабрык і заводаў у Беларусі за 1860–1890-я гады павялічылася ў 15 разоў і склала да канца стагоддзя 1137. Аб'ём вытворчасці на іх узрос у 37 разоў. Сродкі вытворчасці ў гэты перыяд склалі 32 % ад усёй прамысловай прадукцыі Беларусі. Гэты паказчык быў некалькі ніжэй, чым сярэдні па Расійскай імперыі (40 %), але варта ўлічваць традыцыйную спецыялізацыю прамысловасці Беларусі па перапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны [6].

У 90-я гады XIX стагоддзя Расія ажыццявіла імклівы рух наперад у індустрыяльным развіцці. За дзесяцігоддзе прамысловая вытворчасць у краіне ўзрасла ў два разы. Пры гэтым прадукцыя цяжкай прамысловасці павялічылася ў 2,8 раза, а прадукцыя лёгкай – у 1,6, у выніку чаго доля галін, якія займаюцца вытворчасцю сродкаў вытворчасці, у агульным аб'ёме прамысловай прадукцыі дасягнула 1/3 [7, с. 9]. Беларусь знаходзілася ў рэчышчы гэтай тэндэнцыі, што прывяло да ўзрастання ўдзельнай вагі прамысловага сектара ў валавым нацыянальным прадукце ў акрэслены перыяд, і Беларусь паступова ператваралася з краіны аграрнай у індустрыяльна-аграрную.

Нягледзячы на тое, што большасць прадпрыемстваў у разглядаемы перыяд, як і раней, належала дваранам, купецкае прадрымальніцтва адыгрывала прыкметную ролю ў сацыяльнай структуры беларускага грамадства. Так, у 80–90-я гады XX стагоддзя фабрык і заводаў, уласнікамі якіх былі купцы, налічвалася ўжо 88 з 484 існуючых. На іх працавала 10,4 % рабочых. У парэформенны перыяд усе рабочыя сталі вольнанаёмнымі, хаця па-ранейшаму пераважная большасць з іх была выхадцамі з сялянства.

Па нацыянальным складзе як уласнікі, так і рабочыя падзяляліся ў залежнасці ад лакалізацыі фабрык і заводаў. У гарадах большасць уласнікаў і рабочых былі яўрэямі, у сельскай мясцовасці працавалі ў асноўным сяляне. Сярод уласнікаў у заходняй частцы пераважалі палякі і беларусы, ва ўсходняй – беларусы, рускія і палякі [8].

Такім чынам, мадэрнізацыя прамысловасці Беларусі ў разглядаемы перыяд праходзіла нераўнамерна. Калі ў 1860–1870-х гадах кардынальных змен не адбывалася, то пачынаючы з 1880-х гадоў яны становяцца больш істотнымі. Асабліва глыбокія пераўтварэнні адбываюцца ў канцы XIX і ў пачатку XX стагоддзя. На тэрыторыі Беларусі назіраліся прыкметныя тэрытарыяльныя адрозненні, якія наклалі адбітак на ўвесь комплекс мадэрнізацыйных працэсаў. Фабрычна-заводская прамысловасць развівалася ў асноўным у галінах, якія спецыялізаваліся на пераапрацоўцы мясцовай сыравіны, а размяшчаліся гэтыя прадпрыемствы пераважна ў сельскай мясцовасці. Тым не менш роля

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

прамысловасці ў мадэрнізацыйных працэсах у эканамічнай сферы Беларусі была істотнай. Яе развіццё вызначала характар сацыяльных працэсаў у рэгіёне. Пад уплывам эканамічных пераўтварэнняў мянялася і сацыяльная структура насельніцтва Беларусі. Адбывалася яго маёмаснае і сацыяльнае расслаенне. Фабрычна-заводская вытворчасць выцясняла старую феадальную сацыяльна-эканамічную сістэму і стварала ўмовы для ўсталявання новага тыпу адносін, характэрных для індустрыяльнага грамадства.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Болбас, М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860–1900 / М. Ф. Болбас. – Минск: Изд-во БГУ, 1978. – 312 с.
2. *Киштымов, А.* Вопросы экономического развития Беларуси и белорусская национальная идея в начале XX в. [Электронный ресурс] / А. Киштымов. – Режим доступа: http://pdf.kamunikat.org/2181-6.pdf. – Дата доступа: 14.09.2017.
3. *Жытко, А. П.* Метадалогія і некаторыя аспекты гісторыі Беларусі перыяду капіталізму [Электронны рэсурс] / А. П. Жытко. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/bitstream/doc/2441/1/артыкул%20Жытко%20Наша%20н¦ва.pdf. – Дата доступу: 14.09.2017.
4. *Соловьева, А. М.* Промышленная революция в России в XIX в. / А. М. Соловьева. – М.: Наука, 1990. – 272 с.
5. *Абезгауз, З. Е.* Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX века / З. Е. Абезгауз. – Минск: Наука и техника, 1971. – 179 с.
6. *Кохановский, А. Г.* На пути становления индустриального общества: модернизационные процессы в Беларуси (60-е гг. XIX – начало XX в.) / А. Г. Кохановский // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – Вып. 3. – С. 31–46.
7. *Бовыкин, В. И.* Индустриальное развитие России до 1917 г. / В. И. Бовыкин. – М.: Наука, 1970. – 14 с.
8. *Пракаповіч, Л. Э.* Уплыў фабрычна-заводскай прамысловасці на сацыяльныя працэсы ў XIX ст. / Л. Э. Пракаповіч // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2006. – № 2. – С. 33–35.


**(Дата паступлення: 22.09.2017)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## СОДЕРЖАНИЕ

*Шимукович Сергей*. БЕЛОРУССКИЕ РЕГИОНАЛЬНЫЕ ЭЛИТЫ ПЕРИОДА «ДОЛГОГО XIX ВЕКА» КАК ПРЕДМЕТ ИСТОРИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ: ОБОСНОВАНИЕ ПОНЯТИЯ ........ 3

*Загорнов Александр*. ВОЛОСТНОЕ ПРАВОСУДИЕ В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX ВЕКА: ОРГАНИЗАЦИОННО-ПРАВОВОЙ АСПЕКТ ........ 12

*Сыцько Кірыл*. КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЖЫЦЦЯ КАТАЛІЦКІХ ПАРАФІЙ БЕЛАРУСІ НАПРЫКАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ ........ 17

*Киселёв Александр*. СТАТУС ОБЩЕЙ ПОЛИЦИИ В СОСТАВЕ БЮРОКРАТИЧЕСКОЙ ЭЛИТЫ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ (КОНЕЦ XIX – НАЧАЛО XX ВЕКА) ........ 26

*Мацюш Павел*. МАДЭРНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ І ІХ УПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА ........ 31

*Мяньчэня Сяргей*. ПІЦЕЙНЫ ГАНДАЛЬ І СПАЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ Ў МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў ГАДЫ «ВІННАЙ МАНАПОЛІІ» (1897–1914 ГАДЫ) ........ 36

*Шевкун Павел*. ОТ ТРАДИЦИИ К МОДЕРНУ: КОММУНИКАТИВНЫЙ АСПЕКТ ИСТОРИИ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (XIX – НАЧАЛО XX ВЕКА) ........ 44

*Мастяница-Станкевич Ольга*. ИНТЕЛЛИГЕНЦИЯ «ДОЛГОГО XIX ВЕКА»: НОВЫЕ ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ И МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ НАПРАВЛЕНИЯ ИССЛЕДОВАНИЙ В ЛИТВЕ ........ 53

*Арпентьева Мариям*. БЕЛОРУССКИЙ ФОЛЬКЛОР В ИСТОРИЧЕСКОЙ ПАМЯТИ НАРОДА ........ 59

*Бруханчик Екатерина*. РОССИЙСКАЯ ИСТОРИОГРАФИЯ О ПРОБЛЕМЕ ВЛИЯНИЯ ИНОСТРАННЫХ КАПИТАЛОВ НА СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ ФИНАНСОВО-КРЕДИТНОЙ СИСТЕМЫ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XIX – НАЧАЛА XX ВЕКА ........ 66

*Воронович Виталий*. ПРОБЛЕМА БЕЛОРУССКИХ БЕЖЕНЦЕВ В ПЕРИОД ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ: ФОРМАЛИЗМ, ФОРМАЛИЗАЦИЯ, ПОСЛЕДСТВИЯ И УРОКИ ........ 75

*Гушчынскі Ігар*. ПРАВЯДЗЕННЕ РАСІЙСКАЙ СУДОВАЙ РЭФОРМЫ 1864 ГОДА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (У КАНТЭКСЦЕ ПАЛІТЫКІ

Created in Master PDF Editor - Demo Version